Таццяна Сапега

# XVI Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні



Загадчык сектара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі





З 1998 па 2020 г. Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі было арганізавана 16 навуковых канферэнцый пад назвай «Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні», мэтай якіх з'яўлялася кансалідацыя навуковай супольнасці для абмеркавання актуальных пытанняў па кнігазнаўстве, стымуляванне супрацоўніцтва паміж даследчыкамі кніжнай культуры. Нягледзячы на агульнасць асноўнай мэты, кожная з канферэнцый з'яўлялася асобным праектам, які меў сваю тэматыку, рэсурсы, каманду выканаўцаў і непаўторны вынік. Адметнымі былі і сёлетнія XVI Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні.

15 мая 2020 г. на працягу ўсяго дня адбывалася анлайн-канферэнцыя XVI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, прысвечаных 500-годдзю заснавання Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі. Гэта ўпершыню адбылося ў фармаце відэаканферэнцыі ў рэжыме рэальнага часу з магчымасцю шырокай камунікацыі. Праграма мерапрыемства ўключала 64 даклады, яны выкананы на высокім навуковым узроўні, вызначаюцца актуальнасцю, навізной падыходаў да вырашэння пастаўленых навуковых праблем. Разгледжаныя пытанні маюць вялікае навуковае і прыкладное значэнне.

Вынікі міжнароднага праекта:

1. Навуковае мерапрыемства аб'яднала больш за 400 кнігазнаўцаў, бібліятэкараў, лінгвістаў, культуролагаў, гісторыкаў і філосафаў з Беларусі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Украіны і Францыі.

2. Матэрыялы XVI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў паслужылі асновай для стварэння відэаархіва на платформе Youtube, які ўключае відэазапісы выступленняў вядомых айчынных і замежных навукоўцаў, іх прэзентацыі, даклады, фотадакументы і іншыя каштоўныя матэрыялы.

3. На падставе прадстаўленых дакладаў быў выдадзены зборнік матэрыялаў (59 артыкулаў).

4. Канферэнцыя мела вялікі рэзананс: па яе выніках у СМІ з'явілася больш за 50 публікацый, сотні каментароў і рэпостаў у сацыяльных сетках.

У выніку канферэнцыі новае развіццё атрымала вывучэнне кніжнай культуры Жыровіцкага манастыра, гістарычных кнігазбораў Беларусі на працягу стагоддзяў, удакладнены бібліяграфічныя звесткі пра асобныя рэдкія беларускія выданні ў айчынных і замежных зборах, даследаваны роля і месца друкаванай кнігі ў сучаснай інфармацыйнай прасторы і інш.

Кнігазнаўчыя чытанні з'яўляюцца прызнаным аўтарытэтным навуковым форумам і важнай часткай таго комплексу мерапрыемстваў, які дазваляе прадставіць Беларусь як краіну з даўнімі традыцыямі, цесна знітаванай з культурамі іншых еўрапейскіх краін. Вельмі важным з'яўляецца не спыніць традыцыю іх правядзення, таму што канферэнцыя прэзентуе невядомыя старонкі гісторыі кніжнай культуры Беларусі, спрыяе усебаковаму вывучэнню і выкарыстанню яе культурнай спадчыны, з'яўляецца важным штуршком для далейшага трывалага і актыўнага міжнароднага супрацоўніцтва, новых ініцыятыў і праектаў.

Summary

In article summarizes the results of XVI International book readings in the National library of Belarus.